15. Клімковіч, М. Старыя людзі расказваюць або праўда ў дэталях / М. Клімковіч // Маладосць. – 2010. – № 5. – С. 84 – 89; № 6. – С. 111 – 115.
16. Михеенков, С. Когда мы были на войне / С. Михеенков // Неман. – 2010. – № 5. – С. 134–153.
17. Чарнякевіч, Ц. Эпісталярый ваеннага часу / Ц. Чарнякевіч // Маладосць. – 2012. – № 6. – С. 73 – 76.
18. Терпи, мужайся, верь. Письма Василя Витки // Неман. – 2010. – № 4. – С. 148–172; № 5. – С. 154 – 163.
19. «Всегда же со мною твой образ …» // Неман. – 2011. – № 6. – С. 158 – 189; № 7. – С. 139 – 171.
20. Лицкевич, О. Восемь мгновений войны / О. Лицкевич // Беларуская думка. – 2010. – № 4. – С. 75 – 83.

УДК 94(476.5)

В. М. Давідоўская

## САМАРОБНЫЯ ПАРТЫЗАНСКІЯ МЕДАЛІ Ў ЗБОРЫ ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

Вялікая роля ў барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў падчас Вялікай Айчыннай вайны належала партызанам. Для ўдзельнікаў партызанскага руху, якія праявілі мужнасць, адвагу, выдатныя поспехі ў барацьбе з ворагам, а таксама для тых, хто праявіў асаблівыя заслугі ў справе арганізацыі партызанскага руху, 2 лютага 1943 г. савецкі ўрад зацвердзіў спецыяльную ўзнагароду – медаль «Партызану Айчыннай вайны» 1-й і 2-й ступеняў. Пачэсную ўзнагароду атрымалі амаль 127 тысяч чалавек (па дадзеных на 1995 год). Большасць медалёў «Партызану Айчыннай вайны» было ўручана ў пасляваенны час. Але ж узнагароджванне ўдзельнікаў партызанскага руху, адзначэнне іх поспехаў было вельмі актуальным падчас баявой дзейнасці партызан, бо атрыманне ўзнагароды стымулявала да здзяйснення новых подзвігаў, садзейнічала павышэнню актыўнасці партызан, падняццю баявога духу.

Адным са спосабаў заахвочвання байцоў у некаторых партызанскіх атрадах і брыгадах сталі самаробныя ўзнагароды – медалі альбо значкі. Яны зацвярджаліся кіраўніцтвам пэўнага партызанскага злучэння і ў большасці сваёй паўтаралі назвы афіцыйных узнагарод СССР – медалёў «За адвагу», «За баявыя

заслугі». Вырабляліся такія медалі ці значкі, як правіла, на тэрыторыі партызанскіх лагераў з дапамогай падручных сродкаў. Колькі ўсяго было створана самаробных партызанскіх узнагарод на тэрыторыі Беларусі, дакладна вызначыць цяжка. Вядома, што колькасць іх першапачаткова была невялікай. Умовы і абставіны стварэння партызанскіх медалёў і значкоў, колькасны склад асобнікаў, якія захаваліся да сённяшняга часу, робяць гэтыя прадметы фалерыстыкі ўнікальнымі і выклікаюць патрэбу ў іх вывучэнні.

Тры самаробныя партызанскія ўзнагароды захоўваюцца ў фондах Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (ВАКМ). Два медалі былі выраблены для партызан брыгады імя Ракасоўскага. Адна ўзнагарода – атрадны значок – была створана ў партызанскім атрадзе спецыяльнага прызначэння «Баявы».

Брыгада імя Ракасоўскага пачала сваю дзейнасць у ліпені 1942 г. Яна сфарміравалася на аснове атрадаў імя Сталіна, імя Варашылава, імя Молатава, імя Чкалава, імя Чапаева, а таксама 17-га атрада спецыяльнага прызначэння. Да 26 сакавіка 1943 г. брыгада мела назву «За Савецкую Беларусію», пасля перайменавана ў брыгаду імя Ракасоўскага. Дзейнічала ў розных раёнах Віцебскай, Вілейскай, Калінінскай абласцей. З'ядналася з часткамі Чырвонай Арміі 3 ліпеня 1944 г. ў складзе сямі атрадаў агульнай колькасцю 915 чалавек [1, с. 182 – 183].

З нагоды двухгадовага юбілею існавання брыгады кіраўніцтва разам з падпольным райкамам КП(б)Б вырашылі заахвоціць лепшых байцоў. У загадзе па брыгадзе за № 120 ад 25.05.1944 г. адзначалася, што для ўзнагароджання каманднага саставу і партызан устанаўліваюцца юбілейныя памятныя медалі «За храбрасць» і «За заслугі». Для ўсіх узнагароджаных прадугледжваліся таксама ганаровыя граматы [2].

Выкананне медалёў было даручана братам-кавалям Аляксандру і Фёдару Валасевічам, жыхарам в. Канстанцінава Мядзельскага раёна Вілейскай вобласці (зараз Мінскай вобласці), якія супрацоўнічалі з партызанамі. З адшліфаваных срэбраных манет (пераважна польскіх злотых 1921 – 1922 гг.) кавалі зрабілі ўручную 50 медалёў [3]. Палову гэтых узнагарод (25 адзінак) складалі медалі «За заслугі», другую палову – медалі «За храбрасць». Яны не мелі мацаванняў, на рэверсе змяшчалі аднолькавыя надпісы: «В ДЕНЬ 2-х ЛЕТИЯ 5.VII.44». На аверсе знаходзілася пяціканцовая зорка і

надпіс: на адной частцы медалёў – «П. БР. ИМ. РОКОССОВСКОГО / ЗА ХРАБРОСТЬ», на другой частцы – «П. БР. ИМ. РОКОССОВСКОГО / ЗА ЗАСЛУГИ».

Сярод узнагароджаных самаробнымі партызанскімі медалямі брыгады імя Ракасоўскага былі камісар брыгады П.М. Машэраў, начальнік штаба У.Н. Дармянёў, памочнік начальніка штаба Б.Л. Айзенберг, намеснік камандзіра па разведцы Г.І. Казарцаў, партызанка-падрыўніца А.П. Фядуліна і іншыя.

У зборы ВАКМ захоўваюцца два медалі рознага тыпу – «За заслугі» і «За храбрасць». Першы паступіў у музей у 1963 годзе ад жыхара г. Глыбокае У.Ф. Сайкоўскага. Згодна захаваўшымся звесткам, гэты медаль знайшла 6-гадовая дзяўчынка Святлана Кучынская [4]. Уладальнік узнагароды на сённяшні дзень невядомы. Другі медаль перадаў у фонды музея ў 1986 г. былы камандзір партызанскага атрада імя Шчорса брыгады імя Ракасоўскага У.П. Шчуцкі, жыхар г. Мінска. Паводле яго ўспамінаў, узнагарода была выраблена ў партызанскіх умовах кавалём Фёдарам Валасевічам, узнагароджанне адбылося 5 ліпеня 1944 года на станцыі Варапаева Пастаўскага раёна [5].

Яшчэ адна самаробная партызанская ўзнагарода, якая знаходзіцца ў музейнай калекцыі, звязана з дзейнасцю атрада спецыяльнага прызначэння «Баявы». Гісторыя яго стварэння пачынаецца ў 1941 г., калі Пастановай Дзяржаўнага камітэта абароны была сфарміравана асобная мотастралковая брыгада спецыяльнага прызначэння войскаў НКУС СССР, якая выкарыстоўвалася для забеспячэння бяспекі асабліва важных аб’ектаў і асоб. У склад брыгады ўвайшлі кадравыя «чэкісты», пагранічнікі, спартсмены, студэнты і выкладчыкі маскоўскіх ВНУ. У канцы 1941 г. з ліку байцоў брыгады пачалі фарміравацца атрады спецыяльнага прызначэння. Адзін з іх – атрад «Баявы». У лютым (па іншых звестках у сакавіку) 1942 г. атрад «Баявы» ў колькасці 42 чалавек праз «Віцебскія вароты» быў перапраўлены ў тыл ворага. На працягу двух з паловай гадоў атрад дзейнічаў у Расонскім, Полацкім, Асвейскім, Ветрынскім раёнах Віцебскай вобласці, Мядзельскім, Докшыцкім, Ашмянскім раёнах Вілейскай вобласці, у паўднёва-ўсходніх раёнах Літоўскай ССР. Да 1944 г. колькасць атрада ўзрасла да 400 чалавек (галоўным чынам, за кошт мясцовага насельніцтва). Камандзірам атрада з жніўня 1942 г. па чэрвень 1944 г. быў капітан В.Л. Няклюдаў [1, с. 219].

Партызаны атрада «Баявы» кантралявалі чыгуначную лінію Полацк – Себеж, правялі шэраг дыверсій на шашэйных і чыгуначных камунікацыях, у выніку якіх было ўзарвана 125 эшалонаў, пашкоджана 9560 м чыгуначных пуцей, узарвана 25 чыгуначных мастоў, выведзена вялікая колькасць ваеннапалонных з лагераў Баравуха 1-я, 2-я і 3-я.

З мэтай адзначыць найбольш выдатныя заслугі байцоў атрада «Баявы», а таксама з нагоды двухгадовага юбілею дзейнасці гэтага партызанскага фарміравання кіраўніцтва атрада зацвердзіла ўласную ўзнагароду – атрадны значок «2 ГАДЫ Ў ТЫЛЕ ВОРАГА». Значок быў выраблены ў пачатку 1944 года па ініцыятыве камісара атрада С.К. Шчатнёва майстрам-збройнікам Р.А. Сямёнавым з польскай срэбнай манеты. Усяго было выраблена пятнаццаць (па іншых звестках – дванаццаць) асобнікаў.

Узнагарода, якая захоўваецца ў віцебскім музеі, была перададзена яе ўладальнікам, былым начальнікам штаба атрада «Баявы» Л.А. Папкоўскім у 1991 г. Значок уяўляе сабой дыск круглай формы дыяметрам 3,5 см, з вінтавым мацаваннем. На аверсе ў цэнтры выгравіраваны пяціканцовая зорка, серп і молат, па кругу чытаецца надпіс: «2 ГОДА В ТЫЛУ ВРАГА ОТРЯД «БОЕВОЙ» 1942 – 44». Паводле ўспамінаў Л.А. Папкоўскага, узнагароджанне адбылося ва ўрачыстых умовах 13 сакавіка 1944 г. ў в. Ліпава Мядзельскага раёна. Пачэсны знак атрымалі камандзір атрада В.Л. Няклюдаў, парторг С.К. Шчатнёў, байцы Н.І. Падшываленка, А.А. Пракоп'еў, П.Ф. Забоцін, І.Р. Захараў, В.А. Прохараў, С.М. Кустоў, Н.А. Андрэеў, Г.А. Садоўскі, А.М. Наумаў. Па сведчанні Л. Папкоўскага, адзін з атрадных значкоў атрада «Баявы» трапіў да фашыстаў: яны знялі яго з партызана Георгія Садоўскага, які загінуў разам са сваім аддзяленнем у 1944 г. ў Рудніцкай пушчы [6].

Разам з атрадным знакам выдавалася і ганаровая грамата. У фондах музея захоўваецца копія такога дакумента, выдадзенага партызану П.Ф. Забоціну. Тэкст граматы наступны: «Тов. Заботин Павел Федорович, находясь в партизанском отряде специального назначения «Боевой», проявил себя мужественным и дисциплинированным бойцом. За лучшие показатели в пеше-стрелковых состязаниях в день 26-летия РККА и годовщины боевой деятельности отряда в тылу врага награждается отрядным значком» [7].

Пасляваенны лёс самаробных партызанскіх узнагарод атрада «Баявы» і брыгады імя Ракасоўскага склаўся па-рознаму. Асобныя значкі і медалі былі перададзены былымі партызанамі ў музейныя фонды. Напрыклад, акрамя віцебскага музея, срэбраны партызанскі медаль брыгады імя Ракасоўскага захоўвае Мінскі абласны краязнаўчы музей (г. Маладзечна). Некаторыя ўзнагароды да сённяшняга часу знаходзяцца ў сямейных архівах як памяць пра адважных сваякоў. Асобнікі самаробных партызанскіх узнагарод, якія захоўваюцца ў фондах ВАКМ, з'яўляюцца ўнікальнымі музейнымі прадметамі і адносяцца да найбольш каштоўнай часткі музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

1. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Краткие свед. об орг. структуре партиз. соединений, бригад (полков), отрядов (батальонов) и их личном составе / Манаенков А.Л. [и др.] – Мн.: Беларусь, 1983. – 765 с.
2. Приказ № 120 по партизанской бригаде им. Рокоссовского от 25.05.1944 г. (копія) // Віцебскі абласны краязнаўчы музей (ВАКМ). – НД 003910.
3. Процкий, А.Е. Беларусь героическая / А.Е. Процкий. – Мн.: 1985.
4. Новицкая, И. Партизанская медаль / И. Новицкая // Огонек. – 1964. – № 38. – С. 18.
5. ВАКМ. Кніга паступленняў прадметаў асноўнага фонду № 17. – КП 020511.
6. ВАКМ. Кніга паступленняў прадметаў асноўнага фонду № 19. – КП 021597.
7. Грамота Заботину Павлу Федоровичу о награждении отрядным значком. 1944 год (копія) // ВАКМ. – НД 004402/1.

УДК 623.4: 94(476.2)

И. Е. Хоришко

# КОЛЛЕКЦИЯ ХОЛОДНОГО ОРУЖИЯ ПЕРИОДА ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ В ГОМЕЛЬСКОМ ОБЛАСТНОМ МУЗЕЕ ВЕОННОЙ СЛАВЫ